В. Я. Пархута

# Беларуская мова без памылак

2 клас

## Адказы

Мінск
«Аверсэв»
2020

## Урок 1. Вывучаем беларускую мову

**Правяраю сябе**

1. [ч], [ч’], [р], [р’], [г], [г’], [дж], [дз’], [ў], [ц], [ц’]
2. [+] рэчка [ ] карета [+] дождж [+] воўк [ ] писал
   [ ] речка [+] карэта [ ] дождь [ ] волк [+] пісаў
3. бусел бяроза ручай рэпа чмель



**Працую над памылкамі**

1. Чытанне слоў з правільным вымаўленнем гукаў ацэньваецца ў парах.
2. Мая (Родина, Радзіма) — Беларусь. Тут (жывуць, живут) мае самыя блізкія і дарагія (люди, людзі). Мы (говорим, гаворым) па-беларуску.
3. На агародзе вырасла *рэпа*. Каля лесу расце *бяроза*. Па балоце ходзіць *бусел*. На кветку сеў *чмель*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

**Дз**е ма**ц**і нара**дз**іла, — што ма**ц**і родная.
Няма сма**ч**нейшай ва**дзіц**ы, — там і ра**дз**іма.
Ра**дз**іма любая — як з роднай крыні**ц**ы.

## Урокі 2 — 3. Гук [і], літары *І*, *і*

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што гук [і] ў беларускай мове абазначаецца літарамі ***І***, ***і***.
2. Агуркі, бурачкі, памідоры.
3. У агародзе расце *агаро́дніна*.
   У садзе расце *садавіна́*.

**Працую над памылкамі**

1. Лясы, палі, азёры, рэкі, гарады, вёскі — гэта мая Радзіма.
2. Суніцы, маліны, чарніцы.
3. На градцы выраслі *буракі*.
   На яблыні вісяць *яблыкі*.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Ніткі, кніга, іголка, ліст.

## Урок 4. Апостраф (’)

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што апостраф — не *літара*. На месцы апострафа вымаўляецца гук [***й’***].
2. Літары, паміж якімі стаіць апостраф, пры пісьме не злучаюцца.
3. Па двары скачуць шустрыя *вераб’і*.

**Працую над памылкамі**

1. Салаўі, вераб’і, гульня, сям’я, кап’ё, зайка, з’ява.
2. Гадзіннік. (*П’е, б’е*)
3. Дождж — гэта *з’ява* прыроды.
   Заўтра будзе добрае *надвор’е*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Былінка і верабей

Пайшла доўбня валоў **біць** — і цяпер *б’е*.
Пайшлі валы ваду **піць** — і цяпер *п’юць*.
Пайшлі стральцы ваўкоў **біць** — і цяпер *б’юць*.

## Урокі 5 – 6. Гукі [г], [г’], літары *Г, г*

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што гукі [г], [г’] у беларускай і рускай мовах вымаўляюцца *па-рознаму*, але на пісьме абазначаюцца *аднолькава*.
2. Чытанне верша з правільным вымаўленнем гукаў [г] і [г’] ацэньваецца ў парах.
3. герань вяргіня гарлачык гарыцвет



**Працую над памылкамі**

1. Глобус, герб, герой, гаворка,
   гром, гітара, галасы,



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

Грыша, Глеб, Генадзь, Галінка,
ганак, градка, гарбузы.

2. Гэты грэбень ля касы
Грабе траўку-валасы. (*Граблі*)

3. гарбата   грак   гузік   гронка



**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Наградцы вырас *гарбуз*.
Высока ў небе ляцелі *гусі*.
Каця сама прышыла *гузік*.

## Урокі 7—9. Гук [ч], літары *Ч, ч*

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што гук [ч] у беларускай мове заўсёды вымаўляецца *цвёрда*.
2. Чытанне скорагаворкі з правільным вымаўленнем гука [ч] ацэньваецца ў парах.
3. чабор   чаравікі   пчала   чарніцы   чарапаха



**Працую над памылкамі**

1. Авечка

Мы вядзём паіць на рэчку
Кучаравую авечку.
Пі, авечачка, ваду
І вяртайся ў чараду.

2. Чытанне верша з правільным вымаўленнем гука [ч] ацэньваецца ў парах.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

3. Ганна збірае ў лесе *чарніцы*.
Прыемна пахне *чабор*.
З кветкі збірае мёд *пчала*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

У клетцы спявае *шчыгол*.
У рацэ жыве *шчупак*.
Каля бу́дкі бегае *шчаня*.

## Урокі 10—11. Гук [ў] і яго абазначэнне на пісьме

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што гук [ў] на пісьме абазначаецца літарай **ў**.
2. Адгадка: *кніга*. Чытанне загадкі з правільным вымаўленнем гука [ў] ацэньваецца ў парах.
3. смоўж ластаўка аўсянка жаўрук



**Працую над памылкамі**

1. У стаўку купаўся,
Ды сухім застаўся.
І пайшоў, гарласты,
У чырвоных ластах. (*Гусак*)
2. Сёння досвіткам Аўсей
Злавіў аўсянку ў аўсе.
Быў авёс расяны ўранку —
У расе ўся аўсянка.
3. Першымі адлятаюць у вырай *ластаўкі*.
*Жаўрук* будуе гняздо ў траве.
*Аўсянка* любіць зерне аўса.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Як жывёлы на сход збіраліся

Заяц *прыскакаў*. Вуж *прыпоўз*.
Бусел *прыляцеў*. Бабёр *прыплыў*.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

## Урокі 12—13. Гук [ц’], літары *Ц*, *ц*

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што ў беларускай мове ёсць мяккі гук [ц’]. На пісьме ён абазначаецца літарамі ***Ц***, ***ц***.
2. Чытанне верша з правільным вымаўленнем гука [ц’] ацэньваецца ў парах.
3. Там радзіма, дзе *маці* нарадзіла.
   Дзядзька не *бацька*, а *цётка* не матка.

**Працую над памылкамі**

1. Я бягу, і ён бяжыць.
   Я стаю, і ён стаіць.
   Я іду, і ён ідзе,
   Аж пакуль не згасне дзень. (*Цень*)
2. Цэбар ставілі ў цяпло —
   Цеста ў цэбары расло.
   Цераз бераг, цераз край
   Уцякло ў каравай.
3. Бабуля замясіла *цеста*.
   У кошкі мале́нькія *кацяняты*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Яе ні ўбачыць, ні пачуць
Нідзе, нікому анічуць.
Яна між нас штодзень бывае,
А загаворыце — знікае. (*Цішыня*)

## Урокі 14—15. Гук [р], літары *Р*, *р*

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што ў беларускай мове гук [р] заўсёды вымаўляецца *цвёрда*. На пісьме ён абазначаецца літарамі ***Р***, ***р***.
2. Чытанне скорагаворкі з правільным вымаўленнем гука [р] ацэньваецца ў парах.
3. Агарод наш вось такі:
   Бручка, рэпа, буракі,
   Кроп, салата, агуркі.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

**Працую над памылкамі**

1. Гречка, грэчка; грыб, гриб; градка, грядка; крем, крэм.
2. Чытанне верша з правільным вымаўленнем гука [р] ацэньваецца ў парах.
3. Алеся і Марына зрабілі з рабіны пацеркі.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Рыгор і Рыта збіралі ў лесе *арэхі*.
Ігар і Марына рвалі *рабіну*.
Карына знайшла *грыбы*.

## Урокі 16—17. Гук [дз'] і яго абазначэнне на пісьме

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што ў беларускай мове гук [дз'] абазначаецца літарамі ***дз***.
2. Чытанне верша з правільным вымаўленнем гука [дз'] ацэньваецца ў парах.
3. Дзед вады папіў
   са смакам
   і сказаў унуку:
   — Дзякуй!

**Працую над памылкамі**

1. Падзяка, нядзеля, людзі, лядзяш, дзяўчынка, халадзільнік, дзверы, тыдзень.
2. Чытанне скорагаворкі з правільным вымаўленнем гука [дз'] ацэньваецца ў парах.
3. «Будзільнік» наш сядзіць на плоце.
   Яго мы нават не заводзім. (*Певень*)

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Кракадзіл.

## Урок 18. Гук [дж] і яго абазначэнне на пісьме

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што ў беларускай мове гук [дж] абазначаецца літарамі *дж*.
2. Чытанне скорагаворкі з правільным вымаўленнем гука [дж] ацэньваецца ў парах.
3. Ідзе цёплы летні *дождж*ык.
   Будзе добры *ўраджай*.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

**Працую над памылкамі**

1. Ураджай, дажынкі, джала, жаданне, буджу, дождж.
2. Чытанне верша з правільным вымаўленнем гука [дж] ацэньваецца ў парах.
3. У пчалы ёсць *джала*.
   Увосень часта ідуць *дажджы*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Рана ў поле выязджай — будзе добры *ўраджай*.
З вялікага грому малы *дождж.*

## Урок 19. Гукі мовы

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што словы складаюцца з *гукаў*. Гукі мы *чуем* і *вымаўляем*.
   У беларускай мове ёсць «асаблівыя» гукі: [г], [г’], [***дз’***], [***дж***], [***ц’***], [***ў***].
2. кіт — кот, крок — крот, байка — бабка, пень — цень, совы — соты

   кіт крок байка пень совы

   крот цень кот соты бабка
3. Пара́ — *кара́* (*нара́*, *гара́*, *зара́* і інш.), пірог — *парог*, раса — *каса* (*рака*), шоўк — *воўк*, вуха — *муха* (*вуда*), лаза — *каза* (*ваза*, *лава*, *лапа* і інш.).

**Працую над памылкамі**

1. [Ч]арот, смо[ў]ж, [ц’]ішыня, лебе[дз’]і, ш[ч]упак, дож[дж]ык.
2. крама — брама, мука — рука, восы — вочы, крык — крук, парта — карта

   крама мука восы крык парта

   крук вочы карта рука брама
3. Сон — *сом* (*сок*, *сын*), ножык — *вожык*, сук — *жук* (*суп*, *гук*), сініцы — *суніцы*, дым — *дом*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Мая хата — лес-*палац*,
Дзе ляжыць з травы *палас*,
Дзе на сто́лі ззяюць *зоркі*,
Дзе і сок кары не *горкі*,
Дзе магу насіць я *рогі*,
А магу скідаць пад *ногі*.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

## Урок 20. Абазначэнне гукаў на пісьме літарамі

### Правяраю сябе

1. Я ведаю, што гукі на пісьме абазначаюцца *літарамі*. Не абазначае гука літара ***ь***.
2. [дз’] [і] [в] [а] *дзіва*
   [д] [а] [л] [о] [н’] *далонь*
   [б] [у] [л’] [б] [а] *бульба*
3. Вожык — *5* гукаў, *5* літар.
   Дзяцел — *5* гукаў, *6* літар.
   Рысь — *3* гукі, *4* літары.
   Алень — *4* гукі, *5* літар.
   Мядзведзь — *6* гукаў, *9* літар.

### Працую над памылкамі

1. Вось і лета сышло,
   Адспявалі калоссі,
   Цяжка нам заўважаць,
   Як з’яўляецца восень.
2. [в] [о] [с’] [э] [н’] *восень*
   [у] [р] [а] [дж] [а] [й’] *ураджай*
   [дз’] [а] [н’] [о] [к] *дзянёк*
3. Акунь, карась, лешч, лінь, шчупак, карп.

### Заданне для разумнікаў і разумніц

«Малако дае карова», — напісаў на **д**ошцы Вова.
Ліза мазі папрасіла: Лізу **м**уха ўкусіла.
Закрычаў Рыгорка: — З неба ўпала **з**орка!
Горка плача Лена: — Ой, баліць **к**алена!
Не праедзем, дружа, на дарозе **л**ужа.

## Урокі 21—22. Беларускі алфавіт

### Правяраю сябе

1. Я ведаю, што беларускі алфавіт складаецца з *32* літар.
2. Заданне правяраецца ў парах з дапамогай алфавіта на форзацы падручніка.
3. Алень, барсук, воўк, зубр, ліса, янот.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

**Працую над памылкамі**

1. У беларускім алфавіце ёсць «асаблівая» літара **ў**, якой няма ў рускай мове.
2. К ***Л*** М Н ***О*** П ***Р*** ***С*** Т У ***Ў*** Ф ***Х***
3. Бусел, варона, верабей, грак, дзяцел, ластаўка, сарока.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Азбука-дабаўлянка

| | |
|---|---|
| АБВ — лодка па рацэ | ілжэ |
| ГДДз — конь па вуліцы | плыве |
| ЕЁЖ — маці сыну не | ідзе |
| ЗІЙ — дапаможа дзеду | шаша |
| КЛМ — ка́шу я ахвотна | кій |
| НОП — мы паедзем у | страха |
| РСТ — я займуся | з’ем |
| УФХ — крыта шыферам | купэ |
| ЦЧШ — цэлы дзень гудзіць | Я |
| ЬЭЮ — кнігі я чытаць | каратэ |
| Я — вось вам азбука ад А да | люблю |

Якіх літар не хапае ў вершы? *ў, ы*.
Якія літары лішнія? *дз*.

## Урокі 23—25. Напісанне вялікай літары ў словах

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што *прозвішчы* і *імёны* людзей, *клічкі* жывёл, *назвы* краін, гарадоў, вёсак, вуліц, мораў, рэк, азёр пішуцца з *вялікай* літары.
2. У майго (С/с)ябра (М/м)ішы ёсць (С/с)абака (Р/р)экс. Міша гуляе з (Р/р)эксам каля (р/Р)акі (К/к)амышоўкі.
3. Заданне не прадугледжвае запісу аднолькавых слоў, таму правяраецца індывідуальна.

**Працую над памылкамі**

1. [+] імёны людзей
   [+] назвы гарадоў
   [ ] назвы жывёл
   [ ] назвы дрэў
   [ ] назвы месяцаў



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

+ назвы рэк, мораў, азёр
+ назвы вуліц
+ клічкі жывёл

2. Прыпяць, ~~Рака~~, Дняпро, Нёман.
Мінск, Бабруйск, ~~Горад~~, Рагачоў.
Коля, Міша, Дзяніс, ~~Сябар~~.
3. Рака *Вілія*, горад *Полацк*, вуліца *Садовая*, возера *Свіцязь*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Геаграфічная скорагаворка
У Добрушы добра *Дашы*.
У Лепелі лепей *Аліне*.
У Сянно свавольна *Сашы*,
А ў Мар’інай Горцы — *Марыне*.

## Урокі 26—27. Галосныя і зычныя гукі

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што гукі бываюць *галосныя* і *зычныя*.
2. Хочаш добра жыць, павінен працу любіць.
3. З мамай я збіраў с***у***н***і***ц***ы***,
А з бабуляю — ч***а***рн***і***ц***ы***,
Ездзіў з татам у м***а***л***і***н***ы***,
А з дзядулем — у ***а***ж***ы***н***ы***.
А сягоння мы з сястрыцай
Пойдзем разам у бр***у***сн***і***ц***ы***…

**Працую над памылкамі**

1. У беларускай мове *6* галосных гукаў: [***а***], [***о***], [***у***], [***і***], [***ы***], [***э***]. Астатнія гукі — *зычныя*.
2. [у], [о], ~~[й’]~~, [і], [э], [а] — *галосныя*.
[л], [м], [к], ~~[у]~~, [р], [п] — *зычныя*.
3.


бр***у***сн***і***ц***ы***


***а***ж***ы***н***ы***


с***у***н***і***ц***ы***


ч***а***рн***і***ц***ы***

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Матуля.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

## Урокі 28—30. Гукі [у], [ў]. Правапіс слоў з *ў*

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што літара **у** абазначае *галосны* гук, а літара **ў** — *зычны* гук. Літара **ў** пішацца пасля *галосных*.
2. Доктар

   Я на елку палячу,
   Усе галінкі палячу:
   Дзюба ў мяне доўгая,
   Буду стукаць доўга я.
3. Спявала — *спяваў*, ляцела — *ляцеў*, глядзела — *глядзеў*, села — *сеў*.

**Працую над памылкамі**

1. [+] **ў** пішацца пасля галосных

   [–] **ў** пішацца пасля кропкі

   [+] **ў** не пішацца пасля знакаў прыпынку

   [–] ***Ў*** пішацца ў пачатку сказа

   [+] **ў** абазначае зычны гук
2. Ён па лесе скок ды скок,
   Косіць вокам з боку **ў** бок.
   ***У*** дупле вавёрка — шчоўк,
   А яму здаецца — воўк. (*Заяц*)
3. Сябар птушак

   Аўдзей *зрабіў* для птушак кармушку. Ён *насы́паў* у яе зерня. Хлопчык *павесіў* на дрэва кавалачак сала.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Высока ў небе спявае *жаўрук*.
Ходзіць па лузе на доўгіх нагах *журавель*.
Будуе гняздо з гліны *ластаўка*.
Плавае ў возеры *гусь*.

## Урокі 31—33. Склад. Падзел слоў на склады

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю: колькі ў слове галосных гукаў, столькі і *складоў*.
2. Белыя сыплюцца долу крышталікі,
   Белыя крышацца хмаркі ўгары.



Спампавана з сайта www.aversev.by

Сосны захутаны ў белыя шалікі.
Белая мітусь у белым бары.

3. Лі-сі-ца, ва-вёр-ка (ва-вё-рка), а-лень, ку-ні-ца, воўк.

**Працую над памылкамі**

1. У слове «завіруха» *4* склады, таму што ў ім *4 галосныя* гукі.
2. Мароз — *2*, мяцеліца — *4*, лёд — *1*, снег — *1*, снегапад — *3*, завея — *3*.
3. Хто што любіць?
   Заяц любіць *ка-пус-ту* (*ка-пу-сту*).
   Мядзведзь любіць *мёд*.
   Вавёрка любіць *а-рэ-хі*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Снегавік.

## Урокі 34—36. Перанос слоў

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што словы пераносяцца з аднаго радка на другі па *складах*. Склад з адной літары нельга *пакідаць* на радку ці *пераносіць* на другі радок.
2. Мароз, снег, вецер, дождж, шэрань, смуга, адліга — з’явы прыроды. Агонь, вада, паветра, зямля — прыродныя стыхіі.
3. Ле/са/вік па ле/се едзе,
   Са/ні но/выя ры/пяць.
   Лес гу/дзе. Ад/ны мядз/ве/дзі (мя/дзве/дзі)
   У бяр/ло/гах (бя/рло/гах) смач/на (сма/чна) спяць.

**Працую над памылкамі**

1. [+] Спалучэнні літар ***дз***, ***дж***, якія абазначаюць гукі [дз’] і [дж], пры пераносе слоў не раздзяляюцца.
   [ ] Літары ***й***, ***ў***, ***ь*** пры пераносе аддзяляюцца ад папярэдняй літары.
   [+] Склад з адной літары нельга пакідаць на радку.
2. Алеся, Вера, Вольга, Гаўрусь, Глеб, Ігар, Каця, Надзя, Рая, Уладзік, Ульяна, Ядзя, Якуб, Яўген.
3. Ел/ка
   Ел/ка ў ель/ні/ку жы/ла,
   Ел/ка ў ель/ні/ку рас/ла (ра/сла).



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

Ел/ку вез/лі (ве/злі) нам на свя/та
Бе/лы зай/ка і жаў/на.
Як пры/вез/лі (пры/ве/злі) ел/ку ў ха/ту —
Ста/ла ёлач/кай (ёла/чкай) яна.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Як кот шкадлівы, а як *за/яц* баязлівы.
Есць за вала, робіць за *ка/ма/ра*.
На работу — цяляты, а на яду — *ко/ні*.

## Урокі 37—39. Націск

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што склад, які вымаўляецца мацней за іншыя склады, называецца *націскным*, астатнія склады — *ненаціскныя*.
2. Заданне правяраецца ў парах. Звяртаецца ўвага на правільнасць пастаноўкі націску ў словах.
3. На каля́дным стале́ ў белару́саў ёсць куцця́, ры́ба, ляма́нцы, ала́дкі, мёд, грыбы́, кісе́ль.

**Працую над памылкамі**

1. Стра-ва, та-лер-ка, спо-дак, лы-жка, шклян-ка, е-жа, ку-бак, ві-дэ-лец, ка-ва, кі-сель.
2. Заданне правяраецца ў парах. Звяртаецца ўвага на правільнасць пастаноўкі націску ў словах.
3. Румяны Піліп да палкі прыліп. (*Я́блык*)
Не агонь, а пячэцца. (*Крапіва́*)
Белы як снег, салодкі як мёд. (*Цу́кар*)

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Дзядуля сплёў з лазы кашы́.
Бабуля наварыла ка́шы.
У сталовай стаяць сталы́.
Мой дзядуля — ста́лы чалавек.
Надышла зімовая пара́.
Над вадой уздымалася па́ра.
Прадавец паклаў грошы ў ка́су.
Дзяўчынка запляла касу́.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Урокі 40—43. Галосныя гукі [о], [э] — [а]. Правапіс слоў з літарамі *о*, *э* — *а*

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што ў беларускай мове літары ***о***, ***э*** пішуцца ў *націскных* складах. У ненаціскных складах замест іх пішацца літара ***а***.
2. По́ле — палі́, бор — бары́, звон — званы́, мост — масты́, дождж — дажджы́, го́луб — галубы́.
3. горка — г***а***ра́ — пчолы — пч***а***ла́
   норка — н***а***ра́ — козы — к***а***за́
   рэчка — р***а***ка́ — совы — с***а***ва́

**Працую над памылкамі**

1. ***о*** або ***а***? К***о***т — к***а***ты́, кр***о***т — кр***а***ты́.
   ***э*** або ***а***? Стр***э***хі — стр***а***ха́, р***э***кі — р***а***ка́.
2. го́лас — галасы́ — ко́сы — каса́
   жо́луд — жалуды́ — но́гі — нага́
   нос — насы́ — хвост — хвасты́
3. Жарт

   Хвошча, хвошча д***о***ждж.
   Воўк схаваўся ў хв***о***шч.
   Хвост пад хв***а***шчом,
   А сам пад д***а***жджом.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Нядба́лая каза
(З народнага)

На гары́ *каза* з *казлянятамі*,
У до́ле *воўк* з *ваўчанятамі*.
Як прыбег *воўк*, за *казу* хоп,
А *ваўчаняты* за *казляняты*.

## Урокі 44—47. Правапіс слоў з літарамі *е*, *ё* — *я*

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што ў першым складзе перад націскам замест літар ***е***, ***ё*** пішацца літара ***я***. У другім, трэцім і іншых складах перад націскам, а таксама пасля націску пішацца літара ***е***.
2. Лён — ляно́к, лёд — лядо́к, снег — сняжо́к, мёд — мядо́к, пень — пянёк, цень — цянёк.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

3. Вепрукі
З лесу
Выскачыў в***я***пру́к,
А за ім —
Яго с***я***бру́к.
І пабеглі в***е***прукі́
Па сц***я***жы́нцы
Да ракі.
Ну а вы
З усіх бакоў
Размалюйце в***е***пруко́ў.

**Працую над памылкамі**

1. ***е*** або ***я***? Ве́рбы — в***я***рба́, е́лка — ***я***лі́на, мех — м***я***шо́к.
***ё*** або ***я***? Вёў — в***я***ду́, нёс — н***я***су́, вёз — в***я***зу́.
***е*** або ***я***? Па́ц***е***ркі, ве́ц***е***р, це́м***е***нь.
2. Сце́жка — сцяжы́нка, дзед — дзяду́ля, чмель — чмялі́, вёска — вяско́вы, гнёзды — гняздо́.
3. Пайшоў коўзацца к***а***ток
На р***а***чулку, на л***я***док.
Як імчаўся, на х***а***ду
Праваліўся ў в***а***ду.
Замачыў ён чаравічкі,
І касцюм, і рукавічкі.
Нетрывалы быў л***я***док,
Непаслушны быў к***а***ток...

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

На в***я***сёлы наш каток
З неба падае *сняжок*.
Чырв***а***не́юць шчочкі, нос,
Іх фарбуе нам *мароз*.
У м***а***роз, завею птушкі
Нам удзячны за *кармушкі*.

## Урокі 48—49. Гукі і літары. Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што зычныя гукі бываюць *цвёрдыя* і *мяккія*. Мяккасць зычных гукаў на пісьме абазначаецца літарамі ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***, ***ь***.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

2. Я свой вывадак вяду
Па крынічную ваду.

Жартавалі ў лесе лісы:
— Леў з цырульні выйшаў лысы.

3. Воўк вяроўку в***і***ў,
Воўк ад крыўды в***ы***ў:
— Эх, была б вяроўка,
Не ўцякла б кароўка!

**Працую над памылкамі**

1. а, я, о, ё, э, е, і, ы, у, ю, й, ь
2. Ліска і Лыска
Каля лесу бегла Ліска,
А насустрач Лісцы Лыска.
Папрасіла Ліска Лыску:
— Палюляй, сусед, калыску…
Але Лыска ані блізка:
— Не люляў я лысянятак,
Што ж люляць мне лісянятак?
3. Міла мыла…
**М*і*ла** ўранку
Рукі **м*ы*ла**,
Біў струмень бруіста.
А пасля рашыла **М*і*ла**
Вымыць **м*ы*ла** чыста.
Мыла Міла
Мыла, мыла,
Цёрла ўвішна, шустра…
Ой, куды ж прапала **м*ы*ла**?
У далоньках — пуста!

**Заданне для разумнікаў і разумніц**


шчупак
карп


лінь
язь


карась
лешч



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

## Урокі 50—52. Зычныя гукі [д] — [дз’]

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што цвёрды гук [д] абазначаецца на пісьме літарай ***д***, а мяккі гук [дз’] — літарамі ***дз***. Пасля ***д*** пішуцца літары ***а***, ***о***, ***у***, ***э***, ***ы***, а пасля ***дз*** — літары ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***, ***ь***.
2. І ***дз***яцел ведае свой ***д***ом  
На ***д***рэве са старым ***д***уплом.  
Калі і непага***дзь*** — ну што ж,  
Не страшны ***дз***ецям снег і дождж.  
Як добра ў ***дз***ятла пад крылом,  
Калі такі выдатны ***д***ом!
3. 


*дупла*


*дзяцел*


*лебедзь*


*індык*

**Працую над памылкамі**

1. э, о, а, у, ы, е, ё, я, ю, і, ь
2. У Лё***дз***і губы ў мё***дз***е.  
У На***дз***і — кветкі ў са***дз***е.  
***Я******дз***я апранаецца па мо***дз***е.  
Гена***дз***ь катаецца на лё***дз***е.
3. Радзіма, вадзіца, лядзяш, дзеці, дзякуй, ходзіць, у садзе.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

І на сушы, і ў ва***дз***е  
Заднім ходам ён і***дз***е.  
Хто, скажыце, той ***дз***івак?  
Адгадалі? Гэта *рак*.

## Урокі 53—56. Зычныя гукі [т] — [ц’]

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што цвёрды гук [т] абазначаецца на пісьме літарай ***т***, а мяккі гук [ц’] — літарай ***ц***. Пасля ***т*** пішуцца літары ***а***, ***о***, ***у***, ***э***, ***ы***, а пасля ***ц***, якая абазначае мяккі зычны гук, — літары ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***, ***ь***.



Спампавана з сайта www.aversev.by

2. Калыханка

А ты, ка***т***ок шэры,
У ***ц***ябе хвос***ц***ік белы.
Прыйдзі, ка***т***ок, начава***ць***
І дзі***ц***ятка калыха***ць***.

3. рот — *роцік* мост — *мосцік*
кот — *коцік* бант — *банцік*
торт — *торцік* бот — *боцік*

**Працую над памылкамі**

1. э, о, а, у, ы, <u>е</u>, <u>ё</u>, <u>я</u>, <u>ю</u>, <u>і</u>, <u>ь</u>
2. Гэта праўда, што на све**ц**е
Ёс**ць** яшчэ такія дзе**ц**і,
Што не ўмею**ць** малява**ць**,
Шы**ць**, ляпі**ць** і пілава**ць**,
Лялькам хаткі будава**ць**?
3. кары**т**а — *у кары**ц**е*
капо**т** — *на капо**ц**е*
пар**т**а — *на пар**ц**е*
чаро**т** — *у чаро**ц**е*

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Заві***т***ала ў ха***т***у пані
Ды ў жоў***т***ым сарафане.
Як пачалі распрана***ць***,
С***т***алі плака***ць***, пракліна***ць***. (*Цыбуля*)

## Урокі 57—59. Зацвярдзелыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што цвёрдыя зычныя гукі [р], [ж], [ш], [ч], [дж], [ц] не маюць парных *мяккіх* гукаў.
Пасля літар ***р***, ***ж***, ***ш***, ***ч***, ***ц*** і спалучэння літар ***дж*** пішуцца літары ***а***, ***о***, ***у***, ***ы***, ***э***.
2. Правільнасць чытання слоў з зацвярдзелымі зычнымі гукамі [ч], [р], [дж] правяраецца ў парах.
3. Хлеб ч**о**рны, хлеб ж**ы**тні
Я шч**ы**ра ўслаўляю —



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

Смачнейшае е́ж***ы***,
Папраўдзе, не знаю.
Прыемны кавалак,
Што ў соль памакнулі,
Прыемны з але́ем,
Тым болей з ц***ы***буляй.

**Працую над памылкамі**

1. э, о, а, у, ы, е, ё, я, ю, і, ь
2. Дзве рагатыя казулі
Калацілі ў лесе дулі.
Тры малыя вожыкі
Клалі грушы ў кошыкі,
А чатыры зайчаняты
Грушы зносілі да хаты.
3. Спяць і мышкі, і стрыж***ы***,
Спяць маш***ы***ны ў гараж***ы***.
Ты таксама каля мамы
Ціха-ціхенька ляж***ы***.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Ці так?
У вадзе ж***ы***вуць вавёркі,
У дупле ж***ы***вуць бабры.
Совы — у возер***ы*** глыбокім,
А самы — у густым бар***ы***.
Пч***о***лы спяць зіму ў бярлозе,
А мядзведзі — у вуллі́.
Конь спявае на бяр***о***зе,
Вер***а***б'я ў плуг запраглі.

## Урокі 60—61. Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што большасць звонкіх і глухіх зычных гукаў утвараюць пары: [б] — [***п***], [б'] — [***п'***], [г] — [***х***], [г'] — [***х'***], [д] — [***т***], [дз'] — [***ц'***], [з] — [***с***], [з'] — [***с'***], [ж] — [***ш***], [дж] — [***ч***].



Спампавана з сайта www.aversev.by

2.  ***б***ітон  ***п***ітон

 ка***з***а  ка***с***а

 ***д***ом  ***т***ом

 ***дз***ік  ***ц***вік

3. **Дз**ень — ***ц****ень*, **б**очка — ***п****очка*, **з**ала — ***с****ала*, **г**од — ***х****од*, **г**ол — ***х****ол*.

**Працую над памылкамі**

1. [б] — [п], [б’] — [п’], [г] — [х], [г’] — [х’], [д] — [т], [дз’] — [ц’], [з] — [с], [з’] — [с’], [ж] — [ш], [дж] — [ч].
2. Параход прыбыў у ***п***орт. Пасажыры падняліся на ***б***орт.
   Быў сонечны ***дз***ень. Ад дрэў падаў ***ц***ень.
   Ігрок забіў ***г***ол. Футбалісты выйшлі ў ***х***ол.
3. **Зуб** — ***суп***, **ж**ыць — ***ш****ыць*, ка**ж**а — *ка****ш****а*, **г**уста — ***х****уста*, ха**дж**у — *ха****ч****у*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Зойка і сойка

Ягады збірала ***З***ойка,
На сасне сядзела ***с***ойка.
Разглядала ***З***ойка ***с***ойку.
Разглядала ***с***ойка ***З***ойку.
Доўга б ***З***ойка так глядзела.
***С***ойка ж — пырх! — і паляцела.

## Урок 62. Правапіс слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі на канцы і ў сярэдзіне слова

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што парны звонкі зычны гук на канцы слова і ў сярэдзіне слова перад глухім зычным вымаўляецца як парны *глухі*. Каб праверыць яго напісанне, трэба *змяніць* слова так, каб пасля зычнага стаяў *галосны* гук.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

2. пара(д/т) — *парады*
   атра(д/т) — *атрады*
   сця(г/х) — *сцягі*
   салю(д/т) — *салюты*
3. Запытала мама ў (*мышы*) мы***ш***кі:
   — Хто тут лазіў у (*гладышы*) глады́***ш***кі,
   Паздымаў усе (*вяршочкі*) вяр***ш***кі́,
   Панадкусваў (*піражок*) піра***ж***кі?..

**Працую над памылкамі**

1. Горкая часам праца, ды хлеб ад яе салодкі.
2. Ду(б/п) — *дубы*, ме(г/х) — *мяхі*, ву(ж/ш) — *вужы*, арэ(г/х) — *арэхі*.
3. Пейзажы — пейза***ж***, вярблюды — вярблю***д***, сказы — ска***з***, снягі — сне***г***, парогі — паро***г***, грады — гра***д***кі, вушы — ву***ш***кі, мышы — мы***ш***кі.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Што было б тады б, калі б?

Што было б тады б, калі б
З’еў бы воўк ваўчыны гры***б***,
Далічыў мядзве***дз***ь да двух,
Паляваў арол на му***х***?
Што было б тады б, калі б
Рос у хаце эўкаліп***т***,
Выйшаў бы слімак на кро***с***,
Пасвіў слон бадлівых ко***з***?

## Урок 63. Няпарныя зычныя

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што звонкія зычныя [й’], [ў], [р], [м], [м’], [н], [н’], [в], [в’], [л], [л’] не маюць парных *глухіх*. Глухія зычныя [к], [к’], [ф], [ф’] не маюць парных *звонкіх*.
2. Беларуская мова
   Знаёмае мне
   Тваё кожнае слова,
   Бо ты — беларуская,
   Родная мова...
3. Ліна з Нілам ловяць лівень,
   Але лівень —
   Не лянівы:
   То лятае па алеі,



Спампавана з сайта www.aversev.by

То люляе ён лілеі.
Ліна кінулася ўлева,
Ніл за Лінай,
Лівень згінуў
За калінай
Каля млына.

**Працую над памылкамі**

1. Кашу́ля, спадні́ца, камізэ́лька, нагаві́цы, фарту́х, на́мітка, ху́ста, ла́пці, бо́ты, чараві́кі.
2. Маленькі шарык
   Пад лаўкай шарыць,
   Збірае крошкі,
   Баіцца кошкі. (*Мышка*)
3. Лоўка Лёўка маляваў алоўкам
   У аблоках самалёты,
   У якіх сядзяць пілоты.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Па гарызанталі:
3. Кава. 5. Алень. 6. Лавіна. 7. Форма.

Па вертыкалі:
1. Рэльеф. 2. Лайка. 4. Лайнер.

## Урокі 64—67. Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што падоўжанае вымаўленне гукаў [ж], [ш], [ч], [з’], [с’], [л’], [н’], [ц’], [дз’] на пісьме перадаецца *дзвюма* літарамі.
2. Насе***нн***е, га***лл***ё, узвы***шш***а, сукве***цц***е, збо***жж***а, кало***сс***е.
3. Здарэнне
   Кася бегала па класе —
   Кася чаем апяклася!
   Гэта ўбачыўшы здарэ/нне (здарэн/не),
   Рэня ёй дала варэ/ння (варэн/ня),
   Бо сяброўкі
   Рэня з Касяй.
   Парта ж іх —
   Сталоўка ў класе.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

**Працую над памылкамі**

1. <u>Наталля</u>, Марына, <u>Таццяна</u>, Вольга, <u>Настасся</u>, <u>Аўдоцця</u>, Надзя.
2. Пустазе***лл***е лоўка
   Рэжа***цц***а рыдлёўкай.
   Кожны вучань з захапле***нн***ем
   Вытрасае, рве карэ***нн***е.
3. Заазер'е
   Заазер'е,
   Заале/шша (Заалеш/ша),
   Забало/цце (Забалоц/це),
   Замасто/чча (Замасточ/ча),
   Загаро/ддзе (Загарод/дзе),
   Задаро/жжа (Задарож/жа)...
   Жыві, браце,
   Дзе захочаш.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Пчолы жывуць у *вуллі*.
У раслін ёсць *карэнне*.
З ягад вараць *варэнне*.
У полі спее *калоссе*.
У птушак ёсць *крылле*.

## Урок 68. Апостраф (')

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што апостраф пішацца пасля літар, якія абазначаюць *цвёрдыя* зычныя гукі, перад літарамі ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***, калі паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [***й'***].
2. У вераб**'**я шэрае пер**'**е.
   На свята з**'**ехалася ўся сям**'**я.
   На будаўнічым аб**'**екце працуе пад**'**ёмны кран.
3. *Вераб'і* дружна цвыркаюць — да цяпла.
   Зімовы дзянёк з *вераб'іны* скок.
   Калі ў пачатку лютага *надвор'е* яснае — вясна будзе ранняй.

**Працую над памылкамі**

1. <u>Пад**'**ехаў</u>, падвёз, <u>з**'**еў</u>, зламаў, <u>п**'**юць</u>, <u>б**'**юць</u>.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

2. Бегемот

— Беге-беге-бегемот,
У цябе вялікі рот.
Што ты п’еш
І што ясі?
— З’ем банан,
Калі дасі.

3. У лес не *з’ездзіш*, так і на печы змерзнеш.
Лета збірае, а зіма *пад’ядае*.
Каб рыбку *з’есці*, трэба ў ваду лезці.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Ненажэра гэты з’есці
Можа ўсё на свеце.
А нап’ецца ён вады —
Памірае ўміг тады. (*Агонь*)

## Урокі 69—72. Раздзяляльныя знакі — апостраф (’) і мяккі знак (*ь*)

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што раздзяляльны мяккі знак паказвае, што паміж *мяккім* зычным гукам і галосным гукам вымаўляецца гук [***й’***].
2. Міл**ь**ён, грыл**ь**яж, аб’ява, медал**ь**ён, сузор’е, Іл**ь**я, Мар’я.
3. Сур’/ёзны, брыль/янт, з’я/ва, павіль/ён, пад’/езд, камп’/ютар (кам/п’ютар), рэль/еф.

**Працую над памылкамі**

1. а, о, у, ы, э, е, ё, ю, я, і
2. У агародзе вырас бур’ян. Ул**ь**яна поле градкі. Потым Дар’я пал**ь**é агуркі.
3. Мы з сястрычкаю здзівіліся,
І здзіўленне — без канца:
Эль/фы добрыя з’я/ві/лі/ся
На пушынках-дзьму/хаў/цах.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

1. Адзін л**ь**е, другі п’е, трэці зелянее і расце. (*Дождж, зямля, трава*)



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

2. Мяне ўсе просяць,
Мяне чакаюць,
А як толькі з’яўлюся,
Хавацца пачынаюць. (*Дождж*)

## Урок 73. Значэнне слова

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што словы маюць *значэнні*. Удакладніць значэнні слоў можна ў *слоўніку*.
2. Кровать — *ложак*, комната — *пакой*, диван — *канапа*, дверь — *дзверы*, шкаф — *шафа*, пол — *падлога*.
3. Верхняя сценка памяшкання — *столь*.
Прылада для абагрэву хаты — *печ*.
Асвятляльны прыбор — *лямпа*.
Электрапрыбор для захоўвання прадуктаў — *халадзільнік*.

**Працую над памылкамі**

1. У слоўніку ўсе словы запісаны ў *алфавітным* парадку.
2. Потолок — *столь*, зеркало — *люстэрка*, мебель — *мэбля*, стена — *сцяна*, глазок — *вочка*.
3. Збан без ручкі з вузкім горлам — *гарлач*.
Прылада для прадзення льну, воўны — *верацяно*.
Прылада для прасавання бялізны — *прас*.
Тканіна для выцірання рук — *ручнік*.
Бочачка для заквашвання цеста — *дзяжа*.
Дзіцячы ложак — *калыска*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Камп’ютарная мышка.

## Урокі 74—75. Словы, якія называюць прадметы

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што словы, якія называюць прадметы, адказваюць на пытанні *хто? што?* Словы, якія называюць людзей і жывёл, адказваюць на пытанне *хто?* Усе астатнія словы — назвы прадметаў адказваюць на пытанне *што?*
2. <u>Дровы</u> нарыхтоўвае
<u>Працаўніца</u> дбайная,



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

Галава — сталёвая,
Тулава — драўлянае. (*Сякера*)

3. Кветка, крапіва, кавун,
   Кошык, локан, гук, рака,
   Кіт, кашуля, апякун,
   Кі́па, касманаўт, мука.

**Працую над памылкамі**

1. На пытанне х т о? адказваюць словы, якія называюць *людзей* і *жывёл*.
2. Гусь па вуліцы ідзе,
   Дзюбай вуліцу грызе. (*Экскаватар*)
3. Салавей, слімак, салома,
   Сцяг, салют, сядзіба, сон,
   Светлячок, сумленне, стома,
   Святая́ннік, стог, салон.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Адвароткі

Не сядзі раскрыўшы рот,
А чытай наадварот.
Што за звон? Што за шум?
Гэта лётаюць **іхум**. *Мухі* (*хто?*)
Будзеш панам і тузом,
Калі маеш мудры **гзом**. *Мозг* (*што?*)
Не, не змог бы я без вас
Нават дзень пражыць, **ырбяс**. *Сябры* (*хто?*)
Робіць шмат карысных прац
Галасісты наш **кінгяц**. *Цягнік* (*што?*)
Я ад сораму гару,
Як не вывучу **кору**. *Урок* (*што?*)
Выбіваўся зайчык з сіл,
Гналася за ім **асіл**. *Ліса* (*хто?*)
Дык шануйце край свой, хлеб,
Беларуска**, суралеб**! *Беларус* (*хто?*)

## Урок 76. Прыназоўнік

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што прыназоўнікі служаць для *сувязі* слоў у сказе. Яны пішуцца *асобна* ад іншых слоў.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

2. Забялела грэчка <u>ў</u> полі,
Загулі <u>над</u> грэчкай пчолы.
3. Што дзе расце?
Яблыкі растуць *на дрэве*.
Памідоры растуць *на кусце*.
Морква расце *ў зямлі*.
Баравікі растуць *пад елкамі*.

**Працую над памылкамі**

1. Вясной/птушкі/вяртаюцца/<u>з</u>/выраю/<u>ў</u>/родныя/мясціны.
2. <u>На</u> палянačцы лясной,
За ялінаю густой,
Сеўшы <u>на</u> сухі пянёк,
Шые вожык кажушок.
3. Хто дзе жыве?
Мышка жыве *ў норцы*.
Бабёр будуе хатку *на вадзе*.
Верабей будуе гняздо *пад страхою*.
Шпак ладзіць жыллё *ў шпакоўні*.
Сава жыве *ў дупле*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Алесь ***з*** татам пайшлі ***ў*** грыбы. Яны знайшлі ***ў*** ельніку шмат баравікоў. Раптам Алесь заўважыў ***на*** дрэве вавёрку. Вавёрка трымала ***ў*** лапках падасінавік.

## Урокі 77—78. Словы, якія называюць прыметы прадметаў

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, адказваюць на пытанні *які? якая? якое? якія?*
2. Праз горы, даліны,
Праз тысячы сёл
З <u>далёкай</u> краіны
Вярнуўся пасол.
<u>Спаважны</u>, <u>чыноўны</u>,
Ён стаў на страсе,
У ботах <u>чырвоных</u>,
Каб бачылі ўсе.



Спампавана з сайта www.aversev.by

3. Бусел

Бусел — гэта *вялікая* птушка з *доўгімі* нагамі. Пер’е ў яе *белае*, толькі на крылах *чорнае*. Дзюба і ногі *чырвоныя*.

**Працую над памылкамі**

1. ☐ крот, агарод, ход

   ⊞ маленькі, багаты, падземны

   ☐ паўзе, рые, вылез
2. Блакітнае неба, маленькая хмарка, дробны дожджык, лёгкі ветрык, прыгожыя кветкі, цёплае сонейка, зялёныя лісточкі.
3. Навальніца

   Наплылі *цёмныя* хмары. Бліснула *яркая* маланка. Ударыў *моцны* гром. Хлынуў *праліўны* дождж.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Зялёная, а не луг,
белая, а не снег,
кучаравая, а без валасоў. (*Бяроза*)

Вадкае, а не *вада*,
Белае, а не *снег*,
Салодкае, а не *цукар*.

## Урокі 79—80. Словы, якія называюць дзеянні прадметаў

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што словы, якія называюць дзеянні прадметаў, адказваюць на пытанні *што раблю? што робіш? што зраблю?* і інш.
2. Вясна

   Сонца (*што робіць?*) грэе, прыпякае,
   Лёд на рэчцы (*што зрабіў?*) затрашчаў.
   Цёплы вецер (*што робіць?*) павявае,
   Хмар дажджлівых нам (*што зрабіў?*) прыгнаў.
   Вось і бусел (*што зрабіў?*) паказаўся,
   Гусі дзікія (*што робяць?*) гудуць,
   Шпак на дубе (*што зрабіў?*) расспяваўся,
   Жураўлі ўжо (*што робяць?*) лятуць…
3. Будаўнік *будуе* дамы.
   Машыніст *водзіць* цягнікі.
   Цымбаліст *грае* на цымбалах.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

Урач *лечыць* людзей.
Мастак *малюе* карціны.

**Працую над памылкамі**

1. Ходзяць, крок, бяжыць, час, чытае, кніга, смяецца, хлопчык, вучыць, вясёлы.
2. ш т о р а б л ю? — пішу
ш т о р о б і ш? — пішаш
ш т о р о б я ц ь? — пішуць
ш т о з р а б і ў? — напісаў
ш т о з р а б і л і? — напісалі
3. Выразна бачым мы і чуем:
Як у бары піла *пілуе*,
Як самалёт у небе *кружыць*,
Як трактары́ палетак *плужаць*,
Як па дарозе коннік *скача*,
Як у рацэ *лапоча* качка…

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Не рыба, а плыве,
не конь, а ідзе,
не піла, а рэжа. (*Бабёр*)

Не заяц, а *скача*,
Не рыба, а *плавае*,
Не птушка, а камароў *ловіць*.

## Урокі 81—85. Сказ

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што сказ выражае закончаную *думку*. Першае слова ў сказе пішацца з *вялікай* літары. У канцы сказа ставіцца *кропка*, *пытальнік* або *клічнік*.
2. **В**едаеш, якая птушка прылятае з выраю першая**?** **Р**аней за ўсіх прылятае пліска**.** **Г**эта невялікая птушка з доўгім хвастом**.** **Я**е можна ўбачыць каля вадаёма**.**
3. Прыгрэла сонца. На вярбе з’явіліся жоўтыя коцікі. Вылецелі з вулляў пчолы. Закружыліся пчолкі вакол коцікаў.

**Працую над памылкамі**

1. З’явіліся на лузе першыя кветкі. (На лузе з’явіліся першыя кветкі. Першыя кветкі з’явіліся на лузе.)



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

2. **А**дкуль з'яўляюцца лісточкі на дрэвах**? У**сю зіму яны хаваюцца ў пупышках**. В**існою разбудзяць іх птушыныя галасы**. В**ысунуць лісточкі з пупышак свае зялёныя галоўкі**.**
3. Гамоняць зялёнымі галінкамі *дрэвы*. Стукае па дрэве стракаты *дзяцел*. Скача з галінкі на галінку шустрая *вавёрка*. Выбраўся з-пад карча калючы *вожык*.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

Селі акуні (*вераб'і*) на плот,
На рамонку кот (*чмель*) сядзіць.
На вярбе спявае крот (*дрозд*),
У шпакоўні вожык (*шпак*) спіць.
Вусень (*конь*) воз цяжкі́ вязе,
Свінка (*птушка*) скокнула ў гняздзечка.
Па галінцы конь (*жук*) паўзе,
Куранят (*ягнят*) вядзе авечка.

## Урокі 86 – 90. Тэкст

**Правяраю сябе**

1. Я ведаю, што тэкст — гэта некалькі *сказаў*, звязаных паміж сабой па *сэнсе*.
2. Варыянты загалоўка: 1. Кацяня. 2. Выратавальнікі. 3. Як дзеці кацяня выратавалі.
3. Зязюля

   **3.** Птушкі не могуць пазнаць сярод сваіх яек падкіднога.
   **1.** Зязюля не будуе гнязда.
   **4.** Птушаня зязюлі першае вылупляецца на свет.
   **2.** Яна падкідвае яйкі ў гнёзды іншых птушак.
   **5.** Часам яно выкідае з гнязда іншыя яечкі.

**Працую над памылкамі**

1. Некалькі сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе, утвараюць *тэкст*. Загаловак тэксту ўказвае на *тэму* або *галоўную думку* тэксту.
2. Не кранай птушыных гнёздаў!
3. **1.** Вясною верабей вырашыў пабудаваць сабе гняздо ў старой шпакоўні.
   **7.** Ледзьве верабей выратаваўся.
   **2.** Стаў насіць пер'е, травінкі, салому.



Спампавана з сайта www.aversev.by

**4.** Сеў на шпакоўню і пачаў вераб'іным голасам чырыкаць.
**3.** Раптам прыляцеў шпак.
**6.** А тут шпак на яго як наляціць!
**5.** Высунуўся верабей паглядзець, хто спявае.
**8.** Прыйшлося гняздо пад страхою рабіць.

**Заданне для разумнікаў і разумніц**

*Клапатлівы бацька*

**В**ось да высокай алешыны падляцеў стары бусел**.** **Ё**н асцярожна апусціўся на край гнязда**.** **Б**усел прынёс вялікую змяю**.** **Я**му патрэбна было накарміць буслянятак**.** **М**алады бусел хуценька схапіў змяю**.** **Я**на знікла ў дзюбе бусляняці**.**



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

ВЫДАВЕЦТВА АВЕРСЭВ







**Беларуская мова. 2 клас. Рабочы сшытак**

**Беларуская мова. 4 клас. Рабочы сшытак**

Сшыткі (аўтар *В. І. Свірыдзенка*) адпавядаюць падручнікам аўтара В. І. Свірыдзенка і змяшчаюць цікавыя і займальныя заданні, якія дадуць школьнікам магчымасць праверыць і замацаваць атрыманыя на ўроках веды.

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

**aversev.by**

Поўны каталог вучэбнай літаратуры, карысныя матэрыялы, а таксама акцыі і спецыяльныя прапановы.